Настаўніцкая газета
№ 54 (8816), 14 ліпеня 2023 года

# Да ўвагі магілёўскіх абітурыентаў

**Універсітэты і каледжы Магілёўскай вобласці чакаюць каля 12,6 тысячы абітурыентаў.**

"У Магілёўскай вобласці пяць устаноў вышэйшай адукацыі запрашаюць абітурыентаў. Сёлета гэтыя УВА плануюць набраць каля 4,9 тысячы першакурснікаў. З іх крыху больш за 3,2 тысячы — на бюджэт і каля 1,7 тысячы — на платнае навучанне. На некаторыя тэхнічныя і педагагічныя спецыяльнасці павялічаны прыём абітурыентаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Уступная кампанія для атрымання вышэйшай адукацыі пачнецца 17 ліпеня", — праінфармаваў начальнік Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей Пішчоў.

Анансуючы новыя спецыяльнасці, адказны сакратар прыёмнай камісіі Беларуска-Расійскага ўніверсітэта Аляксандр Кашпар адзначыў, што ў 2023 годзе па расійскіх адукацыйных праграмах упершыню адкрыты набор на "Біятэхнічныя сістэмы і тэхналогіі", "Нафтагазавую справу", "Бізнес-інфарматыку", а таксама ўпершыню будуць набіраць бюджэтнікаў на "Замежнае рэлігіязнаўства". У сваю чаргу Андрэй Маёраў, адказны сакратар прыёмнай камісіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А.Куляшова, паведаміў, што ў іх адкрылася "Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя" з тэрмінам навучання 5 гадоў і выдачай дыплома магістра.




**Другі этап уступнай кампаніі ва УВА краіны пачнецца 17 ліпеня.**

А яшчэ ў іх адноўлены набор на "Журналістыку".

У сваю чаргу першы прарэктар Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Андрэй Калмыкоў расказаў, што за 183 гады ў ей падрыхтавана больш за 110 тысяч спецыялістаў. БДСГА — вядучая УВА сельскагаспадарчага профілю як Беларусі, так і краін СНД. Гэта сучасная шматпрофільная ўстанова, якая вядзе падрыхтоўку па 15 спецыяльнасцях на 9 факультэтах. Адзін з вядучых — агратэхналагічны факультэт і яго спецыяльнасці "Вытворчасць прадукцыі раслiннага паходжання" і "Ахова раслін і каранцін", па заканчэнні якіх прысвойваецца кваліфікацыя тэхнолага. Не менш цікавы факультэт біятэхналогіі і аквакультуры і яго спецыяльнасці "Вытворчасць прадукцыі жывёльнага паходжання" і "Водныя біярэсурсы і аквакультура". А вось факультэт механізацыі сельскай гаспадаркі — інжынернага профілю, тут пасля атрымання спецыяльнасцей "Тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі" і "Тэхнічны сэрвіс у АПК" прысвойваецца кваліфікацыя інжынера.

"Толькі ў нашай акадэміі вядзецца падрыхтоўка на ўнікальным, адзіным у Беларусі землеўпарадкавальным факультэце, які з'яўляецца цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для прадпрыемстваў, падпарадкаваных Дзяржкамітэту па маёмасці. Выпускнікі спецыяльнасці "Землеўпарадкаванне і кадастры" атрымліваюць кваліфікацыю землеўпарадчыка. Мы забяспечваем не толькі атрыманне якаснай адукацыі, але і гарантаванае працаўладкаванне", — дадаў Андрэй Васільевіч.

Ён таксама нагадаў пра асаблівасці паступлення на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці. На іх тэрмін прыёму абітурыентаў падоўжаны на 2 дні і адбудзецца з 17 па 27 ліпеня: "Залічэнне на бюджэт пройдзе па 4 жніўня, на платнае навучанне — па 11 жніўня. Пры паступленні на спецыяльнасці па напрамках "Сельская гаспадарка", "Рыбная гаспадарка" і "Ветэрынарыя" здаюцца толькі два іспыты ў форме ЦЭ/ЦТ або экзамену ў акадэміі. Усяго сёлета мы набіраем 875 абітурыентаў на бюджэт і 41 — на платную аснову. Унікальнасць сёлетняй уступнай кампаніі яшчэ і ў тым, што абітурыенты могуць быць залічаны на 8 спецыяльнасцей сельскагаспадарчага профілю без экзаменаў, калі маюць дыплом з адзнакай або атэстат з залатым ці сярэбраным медалём. Акрамя таго, нашы студэнты 3—4 курсаў могуць паралельна атрымліваць другую вышэйшую адукацыю па 6 спецыяльнасцях у нашай Вышэйшай школе аграбізнесу".